Ямаціна А.А., студ. гр. 302 ФК і СКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Клімаў І.П.,
канд. філал. навук, дацэнт

# ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч за сваё не вельмі доўгае жыццё пакінуў шматгранную і разнастайную літаратурную спадчыну: і вершы, і прозу. Пачынаючы з 1944 года, у свет выходзяць творы пісьменніка, які "яшчэ пры жыцці быў прызнаны класікам сучаснай беларускай літаратуры" [с. 3]. Таксама Караткевіч лічыцца заснавальнікам новага жанру беларускай навукова-мастацкай гістарычнай літаратуры ("Дзікае паляванне караля Стаха", "Сівая легенда", "Маці ветру" і г. д.).

Ва ўсіх творах Уладзіміра Сямёнавіча яскравым струменьчыкам праходзяць жаночыя вобразы. Некаторыя з іх дэталёва распрацаваны (Алёнка з "У снягах драмае вясна"), некаторые ледзь абазначаны, але нясуць у сабе значна больш інфармацыі, чым проста выпісаны характар (Бярозка з "Ладдзі роспачы", Ірына з "Сівой легенды"). Жаночыя вобразы ў творах Караткевіча – вельмі шырокае поле даследаванняў, і кожны можа знайці ў ім свой накірунак. Так, напрыклад, Дзяніс Марціновіч у сваім "Паляванні на Алёнку" шукаў рэальны прататып галоўнай гераіні, суадносячы сюжэты некаторых твораў з падзеямі жыцця аўтара.

А мне б хацелася прысвяціць гэтую працу не пошукам рэальных людзей, а даследаванню абагульненых вобразаў роднай зямлі ў празаічных творах Уладзіміра Караткевіча.

На прыкладзе твораў: "Ладдзя роспачы", "Сівая легенда", "Маці ветру", "Дзікае паляваннне караля Саха" можна вылучыць такія вобразы Радзімы, як МАЦІ і КАХАНАЯ (ці сястра).

Характэрнымі рысамі вобраза маці з'яўляюцца не пяшчота, турбота, мяккасць ці міласэрнасць. Наадварот, у апавяданні "Маці ветру" гэты вобраз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заключае ў сабе мужнасць, цвёрдасць, непакорлівасць лёсу і моц, вялікую прыхаваную моц. Ужо пры першай “сустрэчы” мы бачым гэтую ззяючую моц беларускай маці: “Жанчына стаяла на ганку, калі прыезджы, прывязаўшы каня, накіраваўся да хаты. Агонь скупа асвятляў яе зграбную, трошкі цяжкую постаць, цёмную казнатку і рантух […]. А вышэй быў твар як з грэцкай іконы і вялікія сухія вочы, якія дапытліва глядзелі на невядомага”. [с. 154]. Сухія вочы – яны не звыклі да слёз, - і глядзяць не з цікаўнасцю ці жахам, а “дапытліва”. Ні імя, ні ўзросту, ні сацыяльнага становішча… Але мы ўжо ведаем, што гэта Маці. Маці, якая зробіць немагчымае – дапаможа свайму сыну разабрацца ў складанасцях жыцця, аддаўшы за гэта самае дарагое, што ёсць у маці – жыццё свайго дзіця. Дзеля справы, дзеля годнасці імя свайго сына яна вырачэ яго на смерць і адначасова падаруе мужнасць і стымул пражыць сваё скарочанае жыццё, поўнасцю аддаўшыся справе і выканаўшы свае абяцанні. Сухія вочы, нешматслоўнасць і нават тое, што не абняла ў апошні раз свайго сына раскрывае цяжкасць мацярынскага лёсу, прыняцця рашэнняў дзеля сваіх дзяцей у значна большай ступені, чым нават самае дэталёвае апісанне выгляду і думак гэтай гаротніцы-маці.

Гэты вобраз можна параўнаць з вобразам суровай і пакутуючай Радзімы – яна таксама аддае сваіх сыноў у барацьбе за вышэйшыя мэты. Яе сэрца – сэрца маці – будзе разрывацца ад болю і жалю і не мае права праліць хаця б адну слязінку над сваімі дзецьмі. Гэта жорстка і страшна. Але так было заўсёды. І такі ўчынак Маці можа выклікаць глыбокую павагу, хаця не кожнае сэрца прыме і зразумее яго.

Другі абагульнены вобраз у Караткевіча – вобраз маладой дзяўчыны. Яе таксама можна атаясаміць з Радзімай. Вобразаў маладзіцы ў творах Караткевіча значна больш: Бярозка, Ірынка, Надзея Раманаўна. Яны больш разнастайныя, але ўсе яны маюць нешта агульнае, што аб’ядноўвае іх не толькі паміж сабой, але і з разгледзеным вышэй вобразам Маці.

Ірынка (“Сівая легенда”) – прыгонная сялянка, у якую закахаўся малады нобіль. Здаецца, вось яно – шчасце: каханы выкупіць, ажэніцца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

будзе доўгае бесклапотнае жыццё. Але – гісторыя “Папялушкі” не атрымалася. За сваё каханне маладым людзям трэба змагацца. І не проста змагацца, а весці сапраўдную вайну супроць усяго шляхецтва. Ірынку саджаюць пад замок, яна ніяк не можа дапамагчы свайму каханаму, толькі застацца вернай. І гэтае маладое “хударлявае дзяўчо з пекнымі нагамі і прыгожымі рухамі” [с. 29] застаецца вернай да канца. Нават, калі паўстае выбар: быць аслепленай і застацца з каханым ці пайсці ад яго і застацца нескалечанай, Ірынка не вагаецца, лёгкай хадой ідзе да ката і нават удзячна яму, што праз асляпленне яна ўрэшце можа быць побач са сваім адзіным. Якой мужнасцю, вернасцю, якім каханнем павінна поўніцца сэрца, каб маладая дзеўчына згадзілася згубіць зрок?

Наступны вобраз – Надзея Раманаўна Яноўская (“Дзікае паляванне караля Стаха”), апошні нашчадак старажытнага шляхецкага роду. “Гэта была прыгажосць незямная, замучаная, з горкімі вуснамі і вялікімі чорнымі сухімі вачыма” [с. 277]. Зноў – сухія вочы нязвыклыя да слёз. Гэтае дзяўчо катавалі суседзі-шляхціцы дзеля яе спадчыны. Катавалі не фізічна – цкавалі жахам старажытных паданняў, папракалі грахом продка ў дваццатым калене. І зноў мы назіраем стойкасць, мужнасць, духоўную моц, нехарактэрную для дарослага мужчыны, не тое што для васямнаццацігадовай дзяўчыны. Два гады жыве яна на сваім маяраце, поўным прывідаў, з зайздроснымі збяднелымі шляхціцамі навокал, і не здаецца, не збягае, застаецца вернай пастаўленай мэце – сваім жыццём выкупіць грэх далёкага продка.

Яшчэ адзін вобраз – Бярозка (“Ладдзя роспачы”). Язычніца сямнаццаці год – сапраўднае дзіця сваёй зямлі: “Вочы ясныя – нібыта нехта шухнуў крынічнай вадою на торн, - вялікія і прыгожыя і такія ж добрыя” [с. 124]. Патрапіўшы на ладдзю роспачы ў сямнаццаць год, яна не ведала жыцця, але адразу пагадзілася аддаць яго за таго, каго пакахала. І ў гэтым вобразе прысутнічае адданасць і вернасць, мужнасць і духоўная моц.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя высновы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- прататы пам жаночых вобразаў ў навукова-мастацкіх гістарычных творах Уладзіміра Караткевіча можна лічыць Радзіму;
- гэтыя вобразы нясуць у сабе адметныя рысы беларускай ментальнасці: вернасць, мужнасць, духоўная моц, адданасць справе, самаахвяраваннне;
- усе яны, не гледзячы на розныя жыццёвыя абставіны, сацыяльнае палажэнне і інш, прасякнуты адзінай скразной думкай, надзеяй на светлую будучыню, за якую, аднак, прыйдзецца дорага заплаціць.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Караткевіч У. С. Аповесці. Вершы/ У. С. Караткевіч. - Мн.: ООО “Лазурак”, 2000;

2. Караткевіч У. С. З вякоў мінулых / У. С. Караткевіч. - Мн.: “Мастацкая літаратура”, 1978;

3. Марціновіч Д. Паляванне на Алёнку/ Д. Марціновіч// Маладосць. - № 9, 2004. С. 148 – 153;

4. Чумакова Л. Уладзімір Караткевіч Быў. Ёсць. Застанецца/ Л. Чумакова. – Вицебск: 2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ